Падтрымай "Вясну" на PATREON

У рэгіёнах судзяць затрыманых у звязку з акцыямі 1 траўня дапоўнена

02.05.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



2 траўня ў Гомелі і Брэсце судзяць актывістаў і журналістаў, затрыманых напярэдадні і падчас акцыяў пратэсту, якія адбыліся 1 траўня.

Гомель

У судзе Навабеліцкага раёна быў разгледжаны адміністрацыйны пратакол за “дробнае хуліганства” (артыкул 17.1 КаАП) у дачыненні да журналіста-фрылансера, сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў **Яўгена Меркіса**. Суддзя **Сяргей Новікаў** аштрафаваў абвінавачанага ў «лаянцы» Меркіса на 5 базавых велічыняў.

Калегі журналіста мяркуюць, што ён быў прэвентыўна затрыманы міліцыяй з мэтай не даць весці жывую трансляцыю з мітынгу, які ладзілі ў горадзе дэмакратычныя актывісты.

У судзе Савецкага раёна разглядалася справа намесніка старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Васіля Палякова**, затрыманага 1 траўня пасля мітынгу каля ДК «Віпра» за тое, што разгарнуў бела-чырвона-белы сцяг. На падставе двух адміністрацыйных пратаколаў – за парушэнне парадку арганізацыі масавага мерапрыемства (арт. 23.34 КаАП) і непадпарадкаванне міліцыі (арт. 23.4 КаАП) – суддзя **Алена Шайн** пакарала Палякова арыштам сумарна на 15 сутак, паведамляе Свабода.

Брэст

У судзе Ленінскага раёна разглядаюць справы затрыманых удзельнікаў учорашняй акцыі "белых аркушоў".

Чацвярых затрыманых – грамадскіх актывістаў **Інгу Абрамаву**, **Аляксандра Кабанава**, **Уладзіміра Казлоўскага, Аляксея Самайлюка** і блогера **Зміцера Гарбунова** - даставілі ў суд у другой палове дня. Пры гэтым Абрамава пачувалася кепска праз праблемы з ціскам, аднак ніякай медыцынскай дапамогі ёй аказана не было.

Падчас разгляду адміністратыўных справаў Гарбуноў і Кабанаў хадайнічалі аб прадастаўленні адвакатаў, таму іх працэсы перанесеныя і абодва адпушчаныя да суда. Ім выдалі позвы на 3 траўня: суд над Кабанавым, якога вінавацяць па артыкуле 23.4 і ч.3 арт. 23.34 КаАП, прызначаны на 11-ю гадзіну, над Гарбуновым, якога вінавацяць па артыкуле 23.4 КаАП, - на 14:30.

Суддзя **Алег Міранюк** разгледзеў справу Аляксея Самайлюка, на якога быў складзены пратакол па артыкуле 23.34 КаАП. Актывіст прызнаў свой удзел у акцыі і патлумачыў, што трымаў чысты аркуш паперы як сімвал Белай Русі - на знак незадаволенасці палітыкай уладаў. У выніку пакараны штрафам у 15 базавых велічыняў.

Уладзіміра Казлоўскага гэты ж суддзя пакараў арыштам на 10 сутак, а Інгу Абрамаву, прызнаўшы вінаватай паводле ч.1 арт. 23.34, аштрафаваў на 10 базавых велічыняў.

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

